Тамара ЛАЗНЮХА

# З падзякай за шчасце

Прывітанне з нябеснай сінечы
Белы бусел здзяйсняе крылом,
На твае пасталеўшыя плечы
Мір нясе з віншавальным цяплом.

Беларусь – наш куточак утульны –
Называем цябе нездарма
Самай любай і мудрай матуляй –
Прыгажэйшай краіны няма!

Мы святкуем твой Дзень вызвалення –
Гэта лепшае свята са свят.
Подзвіг – сувязь усіх пакаленняў
Ад старэйшых і да немаўлят.

Упрыгожваем працай штодзённай
Сёлы, вёсачкі і гарады.
У братэрскай сям'і шматмільённай
Разуменне знаходзім заўжды.

На далонях блакітных прастораў
Меладычная мова гучыць.
Гімн дзяржаўны ў жыццёвае мора
Змог мацнейшыя словы злучыць.

Незалежнасць, падобную цуду,
Мы ў адзінстве сваім здабылі.
Беларусы былі, ёсць і будуць
Самым мірным народам Зямлі!

Хай усім, хто ад бед багацее,
Перавагай прыходзяць не ў сны
Смех дзяцей – нашай светлай надзеі –
І ўрок пераможнай вясны!